В.Д.Старычонак

КВАНТЫТАТЫЎНЫЯ ДРУГАСНЫЯ НАМІНАЦЫІ

Квантытатыўныя намінацыі (лац. *quantitativus* ‘колькасны’) заснаваны на падабенстве фізічных параметраў прадметных сутнасцей, іх колькасці, памеры, велічыні, вышыні, аб’ёме, вазе, сіле, глыбіні, шырыні, хуткасці і інш. Яны адлюстроўваюць практычна бясконцы і бязмежны свет аб’ектыўнай рэчаіснасці і могуць быць звязанымі з рознымі адзінкамі вымярэння і колькаснымі паказчыкамі. У вектар квантытатыўнай семантызацыі ўключаюцца лексічныя адзінкі, якія суадносяцца як з канкрэтнымі лічбамі, так і з любымі рэаліямі, якія чалавек выкарыстоўвае ў якасці своеасаблівых вымяральнікаў. Канкрэтна-прадметныя намінацыі ў апошнім выпадку служаць для выражэння абстрактных квантытатыўных уяўленняў. У залежнасці ад ступені і сіле квантытацыі (колькаснай характарыстыкі) полісеманты дзеляцца на дзве групы: а) з больш-менш дакладным ці прыблізным колькасным зместам; б) з гіпербалізаваным, завышаным зместам, які, як правіла, не адпавядае прынятым у грамадстве нормам і колькасным крытэрыям.

Маркеры квантытатыўнасці выяўляюцца ў дзвюх групах: у першай у якасці рэпрэзентатараў колькасці выступаюць лічэбнікі з дакладным колькасным паказчыкам, у другой – субстантывы з указаннем на неакрэсленую колькасць.

Полісеманты з дакладным колькасным зместам, як правіла, з’яўляюцца вытворнымі адзінкамі, у якіх колькасны кірунак вызначаецца значэннем зыходных лічэбнікаў. Так, усе ЛСВ полісемантаў *двайняты* суадносяцца з самымі рознымі дэнататамі (бытавымі прадметамі, дрэвамі, людзьмі і інш.), якія часцей за ўсё складаюцца з дзвюх раўнапраўных (раўнацэнных) частак: ‘блізняты’; ‘гаршкі-спарышы’; ‘двайняты-зоры’; ‘спарышы-таполі’; ‘блізка пасаджаныя два радкі бульбы’. Параўн. таксама: *трацяк* ‘цяля, жарабя ва ўзросце трох гадоў’; ‘старая мера плошчы – трэцяя частка зямельнага надзелу’; ‘трэцяя частка ўраджаю, сенакосу і пад.’; ‘трэцяя частка ад выкананай работы’. Такога роду полісеманты выходзяць за межы кампетэнцыі ўласна метафары, і ў лінгвістычнай літаратуры яны лічацца спецыфічнымі семантычнымі ўтварэннямі, што характарызуюцца асаблівасцямі як полісеміі, так і аманіміі [Старычонак 1997, с. 153–174].

Сярод полісемантаў з неакрэсленым квантытатыўным зместам даволі распаўсюджанымі з’яўляюцца структуры, пераасэнсаванні ў якіх развіваюцца па мадэлі «статак, чарада, зграя (жывёл, птушак) → гурт, натоўп (людзей, прадметаў)» (*табун, атара, статак, зграя, вырай, рой, саранча): Азірнуўся сход, але не спазнаў паміж цэлага людскога* ***табуну****, хто абазваўся.* (С.Баранавых); *На калгасных палях –* ***табуны*** *трактароў.* (М.Танк); *Шэрых* ***скалаў табуны*** *з берага сышлі ў ваду.* (Н.Гілевіч); ***Табун*** *высокіх ціхіх зор масціўся на начлег.* (К.Кірэенка); *За* ***табунамі*** *туманоў У асацэ нясуцца качкі.* (К.Цвірка); *Толькі не збівайцеся [людзі] у* ***атару****, толькі не губляйце свайго твару.* (А.Вярцінскі). ***Атары*** *чорных хмар… гвалтоўна засланілі неба*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

яснасць. (В.Лукша); *Разганяе дратаванай пугай* ***статак*** *цёмных* ***хмараў***. (М.Танк); *На захад, за ракой, – Прастор лугоў, палёў І* ***статак*** *пасівелых Шэрых валуноў***.** (М.Танк); *А пад небам –* ***рой*** *крылаты – Самалётаў цэлы* ***вырай***. (Я.Купала); *І яшчэ цэлы* ***вырай*** *пісем*. (А.Васілевіч); *Дзён мітуслівых* ***зграя****, ночы журба старая.* (А.Хатэнка); *Тут мячы паламала крыжацкая* ***зграя***. (І.Багдановіч); *Усюды гаргэкала* ***саранча*** *гандляроў.* (З.Бядуля); *І расселася шляхта, кулакі і магнаты З* ***саранчою*** *асаднікаў, катаў, шпікоў.* (М.Танк); *Апошні званок.* ***Рой*** *дзетвары...* (Г.Дашкевіч); *Людзей разумных шумны* ***рой***. (М. Лужанін); *Куль партызанскіх гарачы* ***рой***. (М.Танк).

Па адваротнай мадэлі «натоўп, зборышча людзей → статак, чарада, зграя» развіліся другасныя ЛСВ у полісемантаў *люд, гурт: Люд ластаўчыны звонка дзінькаў І чыркаў крыламі па шкле.* (Х.Гурыновіч); *У стэпе шэрым, дзе прайшлі дажджы, Гурты авечак шэрых, як аблокі.* (М.Калачынскі); *Дзяўчына белакурая Гусіны гурт пасе.* (М.Хведаровіч).

Прыметы ‘натоўп, гурт, мноства чаго-небудзь’ акцэнтуюцца ў субстантывах з першаснымі ЛСВ ‘войска’, ‘вайсковая група’: *кулацкая* ***арда****, вясковая* ***арда****;* ***атрад*** *літаратараў,* ***атрад*** *настаўнікаў;* ***палкі*** *дармаедаў,* ***палкі*** *баравікоў;* ***полчышчы*** *хмар,* ***полчышчы*** *камароў;* ***рацьсяброў****, працоўная* ***рацьэскадрылля*** *сарок, буслінная* ***эскадрылля;*** ***армія*** *шпакоў, цэлая армія рэдактараў і стылістаў.*

Такі ж кірунак метафарызацыі назіраецца ў полісемантаў *кагал, капэла: Колькі хлопцаў назбіраў у свой* ***кагал****?* (С.Дзяргай); *У гэтым* ***кагале*** *не прымаў удзелу і здаваўся старонлім лозін толькі чалавек*. (А.Васілевіч); *Каля яе заўсёды круцілася цэлая* ***капэла*** *камароўскіх падшыванцаў-хлапчукоў.* (Я.Рамановіч); *З’яўленне навічка было, напэўна, для гэтай вясёлай* ***капэлы*** *нечаканым.* (У.Нядзведскі); *Між грукату і тлуму у вушах* ***Капэла*** *соснаў. роднае спявае.* (Л.Сіманёнак).

У полісемантаў *навала, нашэсце* актуалізуецца дадатковая сема ‘моц, сіла’: ***навала*** *вятроў, чорная* ***навала*** *хмар;* ***нашэсце*** *птушак,* ***нашэсце*** *восаў рахманых.*

Трывалыя асацыяцыі зыходнага ЛСВ з вытворным замацаваліся за полісемантамі з першаснымі інварыянтнымі ЛСВ ‘узгорак, высокае месца’ *(гара, груд)*, ‘масіў дрэў, кустоў’ (*лес, купа),* якія развіваюцца па наступных квантытатыўных мадэлях:

«прыроднае ўзвышша, узгорак, высокае месца → вялікая колькасць чаго-небудзь»: *Чырванатвары мужчына выцягнуў цэлую* ***гару*** *чыгункоў.* (І.Шамякін); *Шумейка зняў* ***гару*** *нейкіх папер і кніжак.* (У.Дамашэвіч); *Адных папер –* ***гара***. (У.Скарынкін); *Яго незвычайныя словы перайшлі цераз* ***горы*** *гадоў.* (П.Глебка); *Свой творчы тлум усе нясуць ка мне. Між рукапісаў* ***гор*** *– я стану горцам.* (К. Жук);

«узгорак → куча зваленых у беспарадку прадметаў, рэчаў; гурт»: *Бачыць: стол стаіць, на ім Кніжак* ***груд*** *багаты.* (І.Шуцько); *Цэлы* ***груд*** *неправераных рахункаў ляжыць на стале.* (М.Лынькоў); ***Груд*** *моладзі абступаў усё цясней старога дудачніка.* (М.Гарэцкі);

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

«група дрэў, кустоў, якія густа растуць → група, гурт людзей»: *Рыгор угледзеў наперадзе густую* ***купу*** *людзей.* (Ц.Гартны); *Перадавыя ўжо тут жа за пераездам зліваліся з* ***купай*** *калгаснікаў.* (Х.Шынклер);

«масіў зямлі, зарослы дрэвамі → вялікая колькасць, мноства чаго-небудзь»*: Маша спакойна села на месца, а ў зале падняўся* ***лес*** *рук.* (М.Гроднеў); *А над дамамі –* ***лес*** *тэлевізійных антэн.* (С.Грахоўскі); *Нагайкі, расстрэлы І* ***лес*** *мітынгаў цэлы.* (Я. Колас).

Да гэтай групы прымыкаюць другасныя ЛСВ, якія развіліся па мадэлі «сродак гужавога транспарту → вялікая колькасць каго-, чаго-небудзь»: *Яна мне нагаварыла дзевяць* ***вазоў*** *слоў пра казённы дом.* (З.Бядуля); *Або вось Андрэйка Парымчык. Дзетак у яго цэлы* ***воз****, хоць і сам яшчэ малады.* (М.Ракітны); *Што да мяне – сумненняў маю* ***воз****.* (М.Віняцкі).

У сэнсавых структурах ***бездань, багна, процьма*** ўвага акцэнтуецца на бясконцасці, бязмернасці, адсутнасці межаў чаго-небудзь: *бездань (акіяна, неба, ночы), бездань (людзей, валасоў), бездань (пачуццяў, гора), багна (прасторы, нябёсаў), процьма (азёр, рыжыкаў, жыццёвых бур).*

Актуалізацыя дадатковай семы ‘рухомасць’ назіраецца ў структуры полісемантаў *хмара, воблака: З усіх бакоў ураз цябе ўсяго акрыла зялёнай* ***хмарай*** *матылькоў.* (Р.Барадулін); *Святло ратавала ад палону, ад* ***хмар*** *кажаноў.* (С.Давідовіч); *Над полем то з шумам узнімаліся, то апускаліся цэлыя* ***хмары*** *шпакоў.* (Я.Курто); *А ў стаўпцы гасцей –* ***Хмара*** *ўсякіх людзей.* (А.Гарун); *На Мінск налятаюць* ***хмары*** *самалётаў, дамы ў агні, здаецца, нават брук гарыць.* (Г.Васілеўская); *Пад трыма хвоямі гудзіць цёмнае* ***воблака*** *куслівых аваднёў.* (З.Бядуля); *На горадам узнятыя* ***аблокі*** *галубоў* (А.Вялюгін).

Квантытатыўныя метафарычныя ЛСВ даволі часта развіваюцца ў субстантывах з агульнай семантыкай ‘водная прастора’ *(плынь, паводка, разліў, наплыў, паток, патоп): Неаглядная* ***людская плынь*** *губляецца дзесь за небакраем.* (А.Ліс); *Косця глядзеў на густую* ***студэнцкую плынь.*** (В.Адамчык); *Жывая* ***людская паводка*** *На плошчу няспынна ідзе.* (М.Смагаровіч); *Над ім застылі небасхілы, Зялёныя* ***паводкі траў.*** (А.Лойка); *Да самага далягляду плывуць блакітныя* ***разлівы льну.*** (П. Беразняк); *Звінеў рамонкавы* ***разліў.*** (М.Пазнякоў); *Зноў Лідскі шлях – той самы* ***наплыў людзей.*** (Ц.Гартны); *І Юрка варочаў галавою, шукаючы сярод* ***людскога патоку*** *на тратуарах дарагую постаць.* (У.Карпаў); *Плывуць і плывуць* ***патокі машын****, звоняць трамваі.* (Х.Жычка); *Якое лета!* ***Сонечны патоп*** *Цягнуўся сорак дзён, сорак начэй.* (Р.Тармола).

Асновай для квантытатыўных пераасэнсаванняў могуць служыць найменні атмасферных ападкаў *дождж, град, лівень*: *Пілы гнуткія цярушаць пілавіння жоўты* ***дождж****.* (П.Панчанка); *Сплывуць стагоддзі, як плыты, І пройдуць зорныя* ***дажджы****.* (Л.Дайнека); *І я ў табун павёў яго, туды, дзе сыпле восень спелы* ***град арэхаў****.* (С.Гаўрусёў); *Ты год вяртаешся назад У безнадзейнасць, асцярожна, І ў вечаровасці астрожнай Ссыпаеш* ***словаў*** *колкі* ***град****.* (В.Куртаніч); *Стаяць пад* ***градам куль і снарадаў****, чакаць дамоўленага сігналу атакі не было сэнсу.* (І.Грамовіч); ***Бед*** *цябе засыпле* ***град***

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

густы. (М.Дукса); *Пральецца* ***лівень*** *спелых сліў з вячэрнім промнем на падворак.* (М.Курыла); *Прайшлі праз свінцовыя* ***ліўні*** (М.Танк); *Хлешча* ***зор*** *сініх* ***лівень***. (М.Танк).

У полісемантаў *лавіна, вал, хваля* на першы план вылучаюцца семы ‘імклівасць’, ‘нястрымнасць’, ‘моц’: ***лавіна*** *дзяцей,* ***лавіна*** *аўтамашын,* ***лавіна*** *трасіруючых куль і снарадаў,* ***лавіна*** *супярэчлівай інфармацыі,* ***лавіна*** *адчаю; снежныя* ***валы***, ***вал*** *атак,* ***вал*** *нямецкага нашэсця,* ***вал*** *маладога* ***смеху;*** *рэвалюцыйная* ***хваля***, ***хваля*** *новага жыцця,* ***хваля*** *абурэння,* ***хваля*** *нястрымнай радасці.*

Менш распаўсюджанымі з’яўляюцца полісеманты, квантытатыўныя ЛСВ якіх развіваюцца ў напрамку ‘малы памер’, ‘невялікая колькасць чаго-небудзь’. Прымета малога памеру аб’ядноўвае найменні разнастайных прадметаў, людзей, насякомых, рыб і інш., параўн.: *моль* ‘вельмі малы матылёк’→ ‘што-небудзь вельмі малое’; *маляўка* ‘маленькая рыбка, малёк’→ ‘чалавек (дзіця) маленькага росту’; *макулінка* ‘зярнятка, макавінка’ → ‘крупінка, дробязь, драбніца’; *крошка* ‘дробная часцінка чаго-небудзь, маленькі кавалачак’ → ‘дзіця’, ‘птушаня’; *кропка* ‘маленькая круглая плямка, крапінка’ → ‘што-небудзь вельмі маленькае ледзь прыкметнае, аддаленае’; *зерне* ‘плод, семя злакаў і некаторых іншых раслін’ → ‘невялікі прадмет, крупінка чаго-небудзь’: *Васіль Іванавіч намкнуўся быў пярэчыць ёй, хацеў нават сурова перапыніць гэтую* ***маляўку***. (М.Лынькоў). *Усе потым гавораць*: *«Ой, якая ты, Валюшак,* ***маляўка*** *побач з Жэняй!»* (У.Мехаў); *Пароўся я доўга ў сваіх кішэнях, нібы шукаў нешта зусім маленькае –* ***макулінку*** *якую.* (А.Масарэнка); *І нават* ***крошка*** *Соня І тая пахвалілася: «І я сама сягоння Вунь чыста як памылася!»* (І.Шуцько); *Хлебнай* ***кропкі*** *мы не маем.* (А.Бялевіч); *Пад нагамі рассыпала Раніца* ***зерні*** *расы.* (С.Грахоўскі).

Сема ‘малая, незначная колькасць каго-, чаго-небудзь’ вылучаецца на першы план у полісемантаў *кропля, капля, крупінка, расінка, глыток, каліва, жменя (жменька).* Метафарычныя ЛСВ, як правіла, скіраваны на выяўленне ўнутранага стану чалавека: *Чалавеку заўсёды хочацца думаць аб прыемным, хай нават прыемнага адна* ***кропля.*** (Я.Каршукоў); *Прыгарнуць усё ў дарозе,* ***Каплю*** *шчасця, долі ўліць...* (Цётка); *Маленькая* ***крупінка*** *сардэчнай цеплыні.* (А.Савіцкі); *Людскога клопату хаця б* ***расінку*** *паўсюль знайду.* (Н.Мацяш); *Мо ў гэты дзень каўтнеш* ***глыток*** *ты волі, А з воляй слаўна хоць бы міг пражыць.* (Я.Хвалей); *Я забываюся слова любоў, каб каханне не страціла сэнсу ні* ***каліва.*** (А.Гуцаў); *Дай мне светлую* ***жменьку*** *надзей.* (Я.Янішчыц); *«Лепей* ***жменя*** *дружбы, як бочка золата», – часта паўтараў вясковы сталяр Марка.* (М.Танк).

Прыём літоты як стылістычная фігура часта выкарыстоўваецца ў творах мастацкай літаратуры: *Конь здаецца з камара, Не ўтаю сакрэту: Не каровы – машкара, Я ж не ведаў гэта.* (Р.Яўсееў); *Ты – паэт камарына-слязлівай нацыі За здароўе сваё воцат п’еш.* (Л.Дранько-Майсюк); *Я сказаў: «Акіян – вялікая лужына».* (А.Вярцінскі); *Палаюць зоркі на небаглядзе,*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

звісаюць нізка, як яблыкі ў садзе. (А.Вярцінскі); *Праз увесь прасцяг зямлі Па галінах вербаў ніцых Хмары вобмацкам паўзлі.* (Х.Гурыновіч).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ